# АЎТАРСКІЯ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІЯ ПЕРАДАЧЫ Ў ЭФІРЫ ТЭЛЕКАНАЛА «БЕЛАРУСЬ 3»

**П. Д. Лук'яновіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск*
*anoe_raimashi@mail.ru*
*навук. кір. – Н. Р. Сцяжко, канд. мастацтвазнаўства, дац.*

Артыкул прысвечаны агляду аўтарскага культурна-асветніцкага тэлебачання Беларусі. Абазначаная тэма сёння з'яўляецца мала даследаванай, таму заслугоўвае асабліва пільнай увагі. Аб'ектам праведзенага даследавання сталі аўтарскія перадачы, якія дэманструюцца ў эфіры нацыянальнага культурна-асветніцкага тэлеканала «Беларусь 3». Асноўная мэта працы заключаецца ў тым, каб ацаніць сучасны стан аўтарскага культурна-асветніцкага тэлевяшчання ў краіне, вылучыць найбольш істотныя праблемы ў развіцці дадзенага сегмента, а таксама вызначыць магчымыя шляхі іх вырашэння. Сёння аўтарскае культурна-асветніцкае тэлебачанне Беларусі прадстаўлена невялікім шэрагам праграм і развіта дастаткова слаба. Аднак павышаць яго якасны ўзровень неабходна, бо ад гэтага залежыць імідж нацыянальнага тэлевяшчання. Прыведзены ў артыкуле аналіз эфірнай практыкі тэлеканала «Беларусь 3» можна разглядаць як арыгінальную спробу абагульніць дасягненні айчыннага культурна-асветніцкага эфіру ў стварэнні аўтарскага кантэнту.

***Ключавыя словы**:* тэлевізійная журналістыка; культурна-асветніцкае тэлебачанне; аўтарская перадача; «Беларусь 3».

Аўтарская праграма характарызуецца высокай ступенню персаніфікаванасці інфармацыі, яе поспех залежыць найперш ад уплывовасці і папулярнасці аўтара-вядучага. Безумоўна, падобная перадача адлюстроўвае светаадчуванне і індывідуальную пазіцыю яе стваральніка.

Сёння ў рускамоўных навуковых крыніцах паняцце аўтарскага тэлебачання не мае канкрэтнага вызначэння. У сувязі з гэтым вылучаюцца толькі асобныя фармальныя прыкметы аўтарскіх праектаў. Найбольш істотная з іх заключаецца ў тым, што аўтар праграмы адначасова з'яўляецца яе вядучым. У сувязі з гэтым трэба падкрэсліць яшчэ адну асаблівасць аўтарскай перадачы, якая адрозніваe яе ад любога іншага тэлевізійнага прадукта. Ёй уласціва максімальная інтэграванасць аўтара-вядучага ў працэс тэлевытворчасці на ўсіх яго ступенях і ва ўсіх аспектах. Задача аўтара – кантраляваць працэс стварэння перадачы, утрымліваючы яе ў межах уласнай канцэпцыі і задумы.

Прыведзены тэзіс знаходзіць пацвярджэнне ў артыкуле амерыканскага даследчыка Брайана О'Доэрці, які пэўны час працаваў мастацкім крытыкам тэлекампаніі «Эн-Бі-Сі» (NBC). О'Доэрці вылучае асобную групу перадач у мастацкім вяшчанні, якія ствараюцца пераважна адным чалавекам. Ён падкрэслівае: «…воздействие таких

программ может быть огромным, поскольку телеэкран предоставлен образованному компетентному человеку, обладающему не только телегеничной внешностью, но и умеющему умно и доходчиво беседовать с самой широкой аудиторией <…> Через воздействие одной личности можно приобщить массового зрителя к новым идеям и породить новые эмоции» [1, с. 208]. Але для падобнага эфекту патрабуецца вядучы асаблівага складу – чалавек, аднолькава дасведчаны ў мастацтве і ў спецыфіцы тэлебачання, са здольнасцямі акцёра і рэжысёра. У найлепшым выпадку, дадае О'Доэрці, ён сам павінен пісаць сцэнарыі і непасрэдна кіраваць работай аператара. Актыўны ўдзел вядучага ў працэсе тэлевытворчасці дае падставу казаць пра высакаякасны эфірны прадукт з выразным індывідуальна-аўтарскім пачаткам.

У айчынным культурна-асветніцкім эфіры не так шмат постацей, якія маглі б адпавядаць згаданым патрабаванням. Адпаведна, колькасць аўтарскіх праграм у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» невялікая. Да іх шэрагу належаць праекты «Люблю і памятаю» Уладзіміра Арлова, «Тэатр у дэталях» Наталлі Бібікавай, «Святло далёкай зоркі» Аляксандра Дамарацкага.

Аўтарскі праект Наталлі Бібікавай «Тэатр у дэталях» з'яўляецца адным з найбольш якасных эфірных прадуктаў тэлеканала «Беларусь 3». Першапачаткова над перадачай працавала тэатразнаўца, загадчыца літаратурна-драматычнай часткі Новага драматычнага тэатра Таццяна Жданава. Пасля на яе месца прыйшла вядучая і рэжысёр тэатральнай рубрыкі ў праграме «Добрай раніцы, Беларусь!» Наталля Бібікава. Гэтая замена пайшла на карысць праекту: вопытная тэлежурналістка трымаецца больш арганічна і разнявалена, яе міміка і жэстыкуляцыя выглядаюць дарэчна і натуральна. Адчуваецца і разуменне аўтарам тэлевізійнай спецыфікі: кадры сталі больш насычаныя, а мізансцэны – разнастайныя. Варта падкрэсліць, што Наталля Бібікава часта выступае не толькі сцэнарыстам, але і рэжысёрам уласнай праграмы, якую з улікам яе складанай жанравай прыроды можна ахарактарызаваць як нарыс-рэпартаж [2, с. 147].

Праграма «Святло далёкай зоркі», якая існуе больш за 15 гадоў, з'яўляецца яркім прыкладам аўтарскай культурна-асветніцкай тэлеперадачы. Аўтар і вядучы праекта Аляксандр Дамарацкі, бяспрэчна, – аўтарытэтная постаць на беларускім тэлебачанні. Журналіст па адукацыі, ён мае вялікі вопыт працы ў тэлеэфіры як карэспандэнт, вядучы, каментатар і стваральнік уласных праграм. Шматгадовая тэлевізійная кар'ера зрабіла Аляксандра Дамарацкага вядомай асобай, якая выклікае цікавасць і карыстаецца даверам аўдыторыі. Яго амплуа ў

кадры – эксперт-біёграф, апавядальнік, які расказвае гісторыі славутых людзей у няспешнай, пранікнёнай манеры, уласцівай таксама знакамітаму расійскаму вядучаму Віталю Вульфу, аўтару праграмы «Мой срэбраны шар». Паводле жанравай спецыфікі «Святло далёкай зоркі» ўяўляе сабой партрэтны тэленарыс. Сёння перадача мае сваё пазнавальнае аблічча: ёй уласціва вобразнасць, прадуманасць візуальнага і музычнага афармлення, а таксама выразны аўтарскі почырк, характэрныя для мастацка-публіцыстычнай групы тэлевізійных жанраў.

Тэлепраект Уладзіміра Арлова «Люблю і памятаю», які існуе ў эфіры тэлеканала «Беларусь 3» не так даўно, з'яўляецца класічным узорам аўтарскай перадачы. Аўтар праграмы – кінарэжысёр, сцэнарыст, пісьменнік, які блізка знаёмы з беларускім культурным асяроддзем, дасканала ведае яго прадстаўнікоў. Гэта дазваляе Уладзіміру Арлову напаўняць біяграфіі сваіх герояў асабістым вопытам, уводзіць іх у кантэкст эпохі, насычаць успамінамі пра рэальныя жыццёвыя сітуацыі. У гэтым заключаецца ўнікальнасць праекта, які значна адрозніваецца ад іншых праграм падобнага кшталту, у тым ліку і «Святла далёкай зоркі». Праекту «Люблю і памятаю» ўласціва выразнае аўтарскае самавыяўленне: з першага выпуску Уладзімір Арлоў пазіцыянуе сябе як аўтар праграмы. Яго маналогі носяць падкрэслена суб'ектыўны характар, вядучы дзеліцца ўласнымі перажываннямі, меркаваннямі, поглядамі. Такім чынам, перадача «Люблю і памятаю» з'яўляецца аўтарскай па ўсіх прыкметах. Асоба Уладзіміра Арлова адыгрывае ў ёй надзвычайную ролю: калі змяніць вядучага, непазбежна зменіцца і аблічча праграмы, яе драматургія і жанравае рашэнне. Варта адзначыць, што «Люблю і памятаю» ўяўляе сабой узор дастаткова складанага жанру – тэлеэсэ. Гэты падкрэслена інтэлектуальны, маналагічны жанр з моцным суб'ектыўна-аўтарскім пачаткам зараз даволі рэдка сустракаецца ў эфіры. Тэлеэсэ заўжды патрабуе пэўнай імправізацыі, спантаннага развіцця думкі, што выдатна дэманструе ў кадры Уладзімір Арлоў.

На сёння можна канстатаваць, што аўтарскае культурна-асветніцкае тэлебачанне развіваецца дастаткова стрымана ў межах тэлеканала «Беларусь 3». У першую чаргу пра гэта сведчыць невялікая колькасць праграм падобнага кшталту. Ствараючы нацыянальнае культурна-асветніцкае тэлебачанне трэба ўсведамляць, што аўтарскія перадачы з'яўляюцца своесаблівым брэндам, фарміруюць імідж тэлеканала. Беларускаму культурна-асветніцкаму эфіру сёння не стае менавіта гэтага элемента «брэндынгу». Каб вырашыць згаданую праблему, патрэбны яркія аўтары-вядучыя, не толькі абазнаныя ў сваім прадмеце, але і

надзеленыя найважнейшай рысай таго, хто прэтэндуе на ролю асветніка ў эфіры, – талентам папулярызатара культуры.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *О'Доэрти Брайен.* Искусство на телевидении // 40 мнений о телевидении. Москва, 1978. – С. 206–210.
2. *Яканюк Д. Л.* Публіцыстычныя жанры, формы і тэхналогіі электроннай журналістыкі. – Мінск, 2008.